**_Прыметнік_ (6 клас)**

*1. Адзначце правільныя сцверджанні:* **1)** Прыметнік адказвае на пытанні ***які? чый?***; 2) Прыметнікі ў сказе паясняюць дзеясловы і адказваюць на пытанні ***дзе? куды? чаму?***; **3)** Прыметнікі ў сказе дапасуюцца да назоўнікаў.

*2. Адзначце прыметнікі:* **1)** блакітны; 2) крык; **3)** крыклівы; 4) сінець; **5)** сіні.

*3. Якія прыметнікі адказваюць на пытанні* ***чый? чыя? чыё? чые?*** *і не спалучаюцца са словамі* ***вельмі, надта****:* 1) якасныя; 2) адносныя; **3)** прыналежныя.

*4. Адзначце словазлучэнні з якаснымі прыметнікамі:* **1)** гарачы дзень; **2)** жоўты лісток; 3) залаты пярсцёнак; 4) ластаўчына гняздо; **5)** салодкі мёд.

*5. Адзначце словазлучэнні, у якіх прыметнікі не з'яўляюцца прыналежнымі:* 1) курыны грэбень; **2)** курыны почырк; **3)** лісіная шуба; 4) лісіная нара.

*6. Прыметнікі якога разраду не маюць ступеней параўнання:* **1)** адносныя; **2)** прыналежныя; 3) якасныя.

*7. Адзначце формы вышэйшай ступені параўнання:* **1)** багацейшы; **2)** даражэйшы; 3) наймацнейшы; **4)** прасцейшы; 5) самы важны.

*8. Адзначце прыметнікі, ад якіх не ўтвараюцца формы параўнання:* **1)** босы; 2) вялікі; **3)** глухі; 4) малады; **5)** сляпы.

*9. Адзначце прыметнікі, утвораныя спосабам складання:* **1)** асенне-зімовы; 2) запалярны; 3) легендарны; **4)** марозаўстойлівы; 5) міжарабскі.

*10. Выкрасліце ў кожным радзе чацвёрты "лішні" прыметнік:* 1) горкі, кіслы, <u>малы</u>, салодкі; 2) адважны, адчайны, <u>лысы</u>, смелы; 3) бабровы, вераб'іны, воўчы, <u>пшанічны</u>.

*11. Адзначце словазлучэнні мужчынскага роду:* **1)** вялік… шымпанзэ; 2) бел… гусь; **3)** нов… шынель; 4) высок… жырафа.

*12. Адзначце сказы, у якіх дапушчаны памылкі ва ўжыванні форм ступеней параўнання:* 1) Паклон табе самы нізкі, мой край залацістых бароў; **2)** Аліна хоць і самая маладзейшая, але ведала ўсе Лізавеціны песні; **3)** На свеце няма больш даражэйшых дарог, чым дарога да роднага дому.

*13. Вызначце род, лік і склон прыметнікаў:* 1) пайсці да лепшага сябра ***М.р., адз.л., Р.с.***; 2) сустрэў старэйшага брата ***М.р., адз.л., В.с.***; 3) у дружным класе ***М.р., адз.л., М.с.***; 4) на высокай гары ***Ж.р., адз.л., М.с.***; 5) пры добрым надвор'і ***Н.р., адз.л., М.с.***.

*14. Ад назоўнікаў, што ў дужках, утварыце і запішыце прыметнікі:* 1) (брат) касцюм ***братаў***; 2) (Зося) кніга ***Зосіна***; 3) (дзед) паліто ***дзедава***; 4) (Міколка) партфель ***Міколкаў***; 5) (сарока) пяро ***сарочына***.

*15. Выберыце правільны варыянт напісання суфіксаў прыметнікаў:* 1) восе(**нь**/н)скі; 2) рыба(кс/**ц**)кі; 3) тавары(шс/**с**)кі; 4) уша(чс/**ц**)кі; 5) таджы(**кс**/ц)кі.

*16. Адзначце словы, дзе прапушчаны НН:* 1) алавя…ы; **2)** даўжэ…ы; **3)** каме…ы; 4) салаўі…ы; **5)** страмя…ы.

*17. Адзначце прыметнікі, якія пішуцца праз злучок:* **1)** беларуска…ўкраінскі; **2)** Буда…Кашалёўскі; 3) Нава…полацкі; 4) права…бярэжны; **5)** паўднёва…заходні.

*18. Адзначце словазлучэнні, у якіх НЕ (НЯ) трэба пісаць разам:* 1) зусім (не, ня)далёкая дарога; **2)** (не, ня)абсяжны прастор; 3) (не, ня)лёгкая, а складаная задача; **4)** (не, ня)чуваны поспех; **5)** (не, ня)сцерпная гарачыня

*19. Падкрэсліце ўсе прыметнікі як члены сказа:* 1) Як многа іх [грыбоў], і ўсе таўсматы, прыземісты, карэнкаваты, чорнагаловы, паўнацелы, як тонкі кужаль, знізу белы; 2) У познюю восень вада пад мастком чыстая і халодная; 3) Які сяголета шчаслівы і ўраджайны год: ва ўсіх садах агрэст і слівы, клубніцы повен агарод.